УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# ГЕРУС СЯМЁН ПЯТРОВІЧ

## ГРАФІК

## 21 ЛІСТАПАДА 1925 Г. – 23 ЛЮТАГА 1998 Г.

**ФОНД № 380**

**ВОПІС № 1**

**1931–1975**

**МІНСК 2021**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1                ф. 380**

| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | РУКАПІСЫ С.П. ГЕРУСА | 1-10 | 1-2 |
| 2. | ПЕРАПІСКА С.П. ГЕРУСА | 11-16 | 2-3 |
| 3. | ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ С.П. ГЕРУСА | 17-22 | 3 |
| 4. | ДАКУМЕНТЫ ПРА С.П. ГЕРУСА І ІНШ. | 23-27 | 3-4 |
| 5. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ | 28-30 | 4 |

## Прадмова

**Герус Сямён Пятровіч** нарадзіўся 21 лістапада 1925 г. у в. Кунічна (цяпер Навагрудскі раён Гродзенскай вобласці) у беднай сялянскай сям'і. У пачатковай школе вучыўся ў в. Гарадзечна таго ж раёна. Працягваў вучобу ў г. Навагрудку. У 1945 г. скончыў Навагрудскае педагагічнае вучылішча. Паступаў у Ленінградскую акадэмію мастацтваў, але не быў прыняты "з-за пражывання на акупаванай тэрыторыі". Год вучыўся на факультэце замежных моў Гродзенскага педінстытута (1945–1946). У 1946–1952 гг. – студэнт графічнага факультэта Дзяржаўнага мастацкага інстытута Літоўскай ССР. Вучыўся ў І. Кузмінскаса, В. Юркунаса. Дыпломная праца – серыя аўталітаграфій "Освобождение и восстановление". У 1952–1953 гг. выкладаў у Дзяржаўным мастацкім інстытуце Літоўскай ССР. У 1953 г. па запрашэнні Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута пераехаў з Вільнюса ў Мінск для стварэння кафедры графікі і эстампнай майстэрні. С.П. Герус быў першым выкладчыкам графічнага аддзялення мастацкага факультэта, навучаў тэхнікам графічнага мастацтва – афорту, дрэварыту, лінарыту і інш., заахвочваў звяртацца да гістарычнай тэматыкі. Працаваў у інстытуце да 1967 г. Сярод яго вучняў былі – А.М. Кашкурэвіч, Л.П. Асецкі, Р.А. Віткоўскі і інш. З 1967 г. да 1970 г. працаваў рэдактарам мастацка-экспертнай калегіі Міністэрства культуры БССР. Сябра Саюза мастакоў БССР з 1956 г. Узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага савета БССР, двума бронзавымі медалямі ВДНГ СССР.

Працаваў у станкавай графіцы ў тэхніцы літаграфіі, лінагравюры, афорта, малюнка. Удзельнік выставак з 1953 г. у Беларусі, Расіі, Літве, Англіі, ЗША, Канадзе, Балгарыі. Выканаў партрэты: "Балерына Л. Ражанава" (1960), "Калгасны пастух С. Карабовіч" (1962), "Паэт П. Макаль" (1963), "І. Буйніцкі" (1963), "Вера Харужая" (1965), "Кампазітар Р. Пукст" (1967), "Паэт П. Броўка" (1967), "Паэт А. Русак" (1971), "Кампазітар А. Туранкоў" (1973), "Скульптар З. Азгур" (1973), "Паэт А. Бачыла" (1973), "Хірург М. Мішэнін" (1975), "Паэт А. Міцкевіч" (1977), "Партызан В. Корж" (1977), "Герой Працы П. Тур" (1980), "Пісьменнік А. Кулакоўскі" (1983), "Скульптар А. Бембель" (1983), "Акадэмік М. Саўчанка" (1985), "Кастусь Каліноўскі" (1985), "Паэт Г. Бураўкін" (1986). Аўтар пейзажаў: "Навагрудскі замак" (1955), "Восень"(1955), "Поле" (1957), "У родных мясцінах" (1963), "Вечар на Свіслачы" (1964), "Навагодні пейзаж" (1965), "Рака Нёман" (1965), "Ветраны дзень" (1966), "Разбураны Мінск" (1972), "Вуліца Няміга" (1978), "Цэнтральная плошча" (1972), "Жыта красуе" (1980). Аўтар кампазіцый: "Перад спускам у шахту" (1960), "Вызваленне Заходняй Беларусі 17 верасня 1939 г." (1967), "Лаўсан" (1970), "У аддзеле тэхнічнага кантролю" (1976), "Мы — беларусы" (1980), "9 мая. Плошча Перамогі" (1984). У канцы 1980-х — 1990-я гг. выканаў серыю эстампаў "Стары Мінск", партрэты гістарычных асоб Беларусі – Міндоўга, Гедыміна, Вітаўта, Сапегі, пісьменнікаў – Л. Геніюш, Н. Арсенневай, С. Грахоўскага. Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, фондах Беларускага

саюза мастакоў, Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва ў Мінску, Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і інш., у замежных краінах.

Сямён Пятровіч Герус памёр 23 лютага 1998 г. у г. Мінску.

Дакументы Сямёна Пятровіча Геруса паступілі ў БДАМЛМ у жніўні 1976 г. ад яго самаго. У фондзе мастака адсутнічаюць яго арыгінальныя творчыя працы. У выніку навукова-тэхнічнай апрацоўкі быў складзены вопіс № 1 у колькасці 30 адзінак захоўвання (101 дакумент) за 1931–1975 гг.

Вопіс складаецца з 5-ці невялікіх раздзелаў, справы ў якіх сістэматызаваны па храналогіі.

Прадмову склала Г.Б. Багамолава
Вядучы архівіст
12.01.2021

Беларускі дзяржаўны архіў-музей
літаратуры і мастацтва

ФОНД № 380
ВОПІС № 1
1931-1975

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пратакол ЭМК БДАМЛМ
ад 18.03.2021
№ 3

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. РУКАПІСЫ С.П. ГЕРУСА** | | | | |
| 1 | "Касмапаліты, зневажаючыя беларускі народ і яго культуру", "Миру и счастью людей посвящается...", "Прекрасное - значит современное" і інш. Артыкулы аб праблемах сучаснага мастацтва, аб рэспубліканскай мастацкай выстаўцы "На страже мира" і інш.<br>Чарнавы аўтограф, аўтарызаваны машынапіс, машынапіс з аўтарскай праўкай | 1953-1964 | 57 | 4 | |
| 2 | "Записная книжка города", "Майстар" (у сааўт. з У.А. Бойкам), "Пяром і разцом", "Таленты розныя, арыгінальныя" і інш. Артыкулы пра персанальную выстаўку і творчасць З.І. Азгура, выстаўку польскай графікі, пра развіццё выяўленчай рэкламы і інш.<br>Выразкі з газет "Літаратура і мастацтва", "Новае Палессе" і інш. | 1963-1971 | 7 | 6 | |
| 3 | "І грузавік павінен быць прыгожы". Артыкул аб недахопе мастацкага густу ў вытворчасці абутку, адзення, мэблі і інш. Варыянты.<br>Чарнавы аўтограф, машынапіс з рэдактарскай праўкай | [к. 1960-х гг.] | 41 | 3 | |
| | * * * | | | | |
| 4 | "Графіка С.П. Геруса", "Графика Г.Г. Поплавского", "Мастацтва графікі" і інш. Выступленні на тэлебачанні.<br>Чарнавы аўтограф, машынапіс з праўкай | 1959-[1969] | 44 | 6 | |
| 5 | Выступленні на семінары самадзейных мастакоў і інш. аб мастацтве графікі. Варыянты.<br>Аўтограф з нязначнай праўкай | [1963-1964] | 28 | 3 | |
| 6 | Выступленні на рэспубліканскай выстаўцы графікі з крытыкай графічных прац мастакоў Л.П. Асецкага, І.Р. Гембіцкага, Р.П. Клікушына, Б.М. Кузмічова, Я.П. Пакаташкіна, А.А. Паслядовіч, А.М. Тычыны і інш., на адкрыцці выстаўкі польскай графікі з прывітальным словам і інш. | [1963-1965] | 11 | 4 | |

| №№ п/п | Загалоўкі справў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 7 | Выступленні ў Саюзе мастакоў БССР, на з'ездах мастакоў БССР і інш. аб становішчы беларускага мастацтва і мастакоў, аб сучасным у мастацтве і інш. Варыянты.<br>Аўтограф, чарнавы аўтограф | 1964-1972 | 55 | 8 | |
| 8 | "Культура рекламы - реклама культуры". Выступленні на калегіі Міністэрства культуры БССР, на пасяджэнні ў ЦК КПБ аб паляпшэнні выяўленчай рэкламы.<br>Аўтограф, чарнавы аўтограф, машынапіс, машынапіс з праўкай | 1966-1967 | 64 | 4 | |
| | *   *   * | | | | |
| 9 | "A Royal Guardsman" ("Каралеўскі гвардзеец"), "A Street in Brighton" ("Вуліца ў Брайтане"), "Caroline is a student at Oxford" ["Караліна студэнтка Оксфарда"] і інш. Рэпрадукцыі гравюр С.П. Геруса. Выразкі з часопіса "Culture and life" ("Культура і жыццё") | 1961 | 5 | 4 | |
| 10 | Партрэты Я. Брыля, Р.К. Пуксты, В.П. Таўлая і інш. Рэпрадукцыі гравюр С.П. Геруса.<br>Выразкі з газет "Вечерний Минск", "Літаратура і мастацтва" | 1969-[1974] | 4 | 10 | |
| | **2. ПЕРАПІСКА С.П. ГЕРУСА** | | | | |
| 11 | Пісьмо С.П. Геруса начальніку аддзела мастацтва ЮНЭСКА Пітэру Бэлью па асабістых пытанях. На французскай мове | [к. 1960-х - п.п. 1970-х гг.] | 1 | 1 | |
| | *   *   * | | | | |
| 12 | Мастацкая віншавальная паштоўка з Новым годам ад мастака  Вернэра (E. Werner) (ФРГ). На нямецкай мове | 1959 | 2 | 1 | |
| 13 | Пісьмо Барыса Тура. На польскай мове. (г. Лондан) | 1962 | 4 | 1 | |
| 14 | Пісьмо Т. Адамовіч (алімпійская чэмпіёнка па фехтаванні).<br>Прыкладзены тры індывідуальныя фатаграфіі С.П. Геруса. Лл. 3-5 | 1970 | 5 | 4 | |
| 15 | Пісьмы і віншавальная паштоўка Вів'ен Сэвідж (Vivienne Savage). На англійскай мове. (г. Лондан) | [1970-я гг.] | 8 | 6 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | * * * | | | | |
| 16 | Пісьмо школьнага музея СШ № 4 г. Слоніма С.П. Герусу з просьбай падарыць ім свае творчыя працы для экспазіцыі музея | 1969 | 1 | 1 | |
| | **3. ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ С.П. ГЕРУСА** | | | | |
| 17 | Грамата Саюза савецкіх аб'яднанняў сяброўства і культурнай сувязі з замежнымі краінамі С.П. Герусу за актыўную працу па развіцці і ўмацаванні сяброўскіх і культурных сувязяў з замежнымі краінамі і інш. | [1957-1975] | 1 | 1 | |
| 18 | Выпіска з пратакола пасяджэння журы адкрытага конкурсу Мастацкага фонду БССР "на стварэнне твораў мастацтва, прысвечаных лепшым людзям нашых дзён, нашай гераічнай працы" аб прысваенні другой прэміі С.П. Герусу за графічныя творы "Загадка" і "№ 100" | 1960 | 1 | 1 | |
| 19 | Буклет выстаўкі твораў мастака С.П. Геруса | 1963 | 3 | 1 | |
| 20 | Анкета і характарыстыка-рэкамендацыя С.П. Герусу для паездкі ў Польшчу | 1965, 1966 | 3 | 2 | |
| 21 | Дамова паміж дырэктарам Камбіната графічнага мастацтва Маскоўскага аддзялення Мастацкага фонду РСФСР Ф.С. Амсціслаўскім і С.П. Герусам на стварэнне мастацкага твора "Пейзаж" у тэхніцы афорт | 1965 | 1 | 1 | |
| 22 | Прыёма-здатачная накладная Барысаўскага камбіната прыкладнога мастацтва аб выдачы са склада ў аддзел камісійнага продажу ў салон-магазін графічных твораў С.П. Геруса (афорты: "Берёзки", "На берегу озера", "Река Неман", літаграфіі: "Ленин у окна", "Поле" і інш.) | 1975 | 1 | 1 | |
| | **4. ДАКУМЕНТЫ ПРА С.П. ГЕРУСА І ІНШ.** | | | | |
| 23 | У.А. Бойка. "У майстэрні Сямёна Геруса", М. Барысаў. "Художник героической темы", Г. Лапкоўскі. "Калі збываюцца мары" і інш. Артыкулы пра С.П. Геруса і яго творчасць. Выразкі з газет | 1964-1969 | 9 | 9 | |
| 24 | "Dailininku septintasis". Артыкул аб VII з'ездзе мастакоў Літоўскай ССР з упамінаннем С.П. Геруса. На літоўскай мове. Выразка з газеты "Literatura in menas" ("Літаратура і мастацтва") | 1969 | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 25 | Л. Балткальніс. "Яркие краски", А. Жукоўскі. "Падарунак школьнаму музею" і інш. Артыкулы з упамінаннем С.П. Геруса. Выразкі з газет | 1969-1973 | 6 | 6 | |
| | * * * | | | | |
| 26 | Буклет выстаўкі "Grafik und glas aus der Bjelorussischen Sozialistischen Sowjetrepublik" ("Графіка і шкло з БССР") у г. Берліне. З удзелам С.П. Геруса | 1966 | 5 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 27 | Артыкулы аб IX з'ездзе мастакоў Беларусі з дакладам В.А. Грамыкі, VII з'ездзе мастакоў Літвы. На беларускай і літоўскай мовах. Выразкі з газет | 1969, 1973 | 3 | 2 | |
| | **5. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ** | | | | |
| 28 | Фатаграфіі С.П. Геруса, індывідуальныя і ў групе з неўстаноўленымі асобамі | 1959-1973 | 6 | 6 | |
| | * * * | | | | |
| 29 | Фатаграфія А. Г. Герус (маці С.П. Геруса) | [1945-1946] | 1 | 1 | |
| 30 | Фатаграфіі дзяцей з вёскі Дзятомлі і хаты ў вёсцы Кунічна (цяпер Навагрудскі раён Гродзенскай вобласці) | 1931, 1946 | 2 | 2 | |

У дадзены вопіс унесена 30 (трыццаць)

спраў з № 1 па № 30 , 101 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонда зрабіла

______________________

Дакументы прынялі:

______________________

______________________

"_____"____________20____ г.